SEX=БАЛЯСЫ

# ШТО І СВЕЦІЦЬ, І ГРЭЕ

**Іспанскія вучоныя нядаўна даказалі: каханне рэальна грэе. (Адразу ж не магу ўстрымацца ад зайздрасці: «Вучоныя-даследчыкі ў галіне сексу доследным шляхам устанавілі, што не так ужо і дрэнна быць вучонымі-даследчыкамі ў галіне сексу».) Яны высветлілі, што тэмпература скурнага покрыва можа быць добрым індыкатарам рамантычных пачуццяў. («Я стамілася, я нікому не патрэбная, мяне ніхто не любіць! — А ты дакладна ўсіх апытала?») Удзельнікаў эксперыменту сфатаграфавалі ў інфрачырвоных прамянях. Затым «паддоследныя» па чарзе акуналі рукі ў ледзяную ваду. Пасля чаго закаханым добраахвотнікам паказвалі фота іх рамантычных партнёраў, а астатнім — здымкі сяброў. І высветлілася, што ў першых удзельнікаў эксперымента рукі адаграваліся хутчэй, чым у другіх.**

Паскоранаму саграванню закаханых спадарожнічала павышэнне тэмпературы шчок, ілба і носа. Яна павялічвалася ў сярэднім на два градусы, што і фіксаваў цеплавізар. «І не сорамна вам, дзяўчына, такія сексуальныя фантазіі ў мяне выклікаць?!» Чым глыбей пачуцці, тым больш відавочнай была рэакцыя. («Як дабіцца сексу ад дзяўчыны? 1. Кахаць. 2. Заляцацца. 3. Дарыць кветкі і прэзенты. 4. Нагадваць ёй, што яна — ваша жонка, у рэшце рэшт».)

У многім падобны эксперымент пры дапамозе тых жа цеплавізараў правялі канадскія вучоныя-медыкі. Высвятлялі некалькі іншае, чым іх іспанскія калегі, але вынік атрымалі такі ж. Даследчыкі задаліся мэтай праверыць: ці праўда, што жанчынам трэба нашмат больш часу, каб «завесціся» сексуальна. Падчас эксперымента 30 жанчынам і 30 мужчынам паказвалі відэа эратычнай накіраванасці. («Нямеччына навукоўцы стварылі антывіягру для спакойнага і ўдумлівага прагляду фільмаў «для дарослых».) І засякалі, за які час яны ўзбудзяцца. Высветлілася, што мужчыны даходзілі «да кропкі кіпення» ў сярэднім за 665 секунд, а жанчыны — за 743 секунды. Па меркаванні даследчыкаў, адрозненне ў 78 секунд не з'яўляецца такім ужо і значным. («Аднойчы ты засумуеш па мне і зразумееш: час вучыць, а не лечыць».) Маўляў, прадстаўнікі абодвух палоў «даходзяць да кандыцыі» за аднолькавы час.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

І вось што цікава. Медыкі падкрэслiваюць: вымярэнні былі дакладнымі (зноў глядзі самы першы анекдот у пачатку). На экранах цеплавізараў было добра бачна, як награваюцца інтымныя месцы «паддоследных». І ў мужчын, і ў жанчын, якія былі ахоплены эратычным настроем, тэмпература «там» павялічвалася, як у закаханых з эксперымента іспанскіх вучоных, усё на тыя ж два градусы. «Фліртуе па-вясковаму. «Ульяна, ты цыбулю ясі? — Ем. А сала ясі? — Ем. Ах ты, мая ласуха!»)

Але каханне, як вядома, не толькі грэе. Можа хто памятае савецкі фільм «Ход у адказ» пра сумесныя вучэнні дэсантнікаў і марскіх пехацінцаў? Камандзіра апошніх — капітан-лейтэнанта Швяца — іграў брутальны Вадзім Спірыдонаў. У яго групе радыстам была сяржант Зіноўева ў выкананні актрысы Алены Глебавай. Для тых, хто не ў курсе: гаворка ідзе пра службу дзяўчыны ў страявой вайсковай часці элітнага роду войскаў. Наўрад ці такое магло быць у жыцці, але гэты кіношны прыём нікога ў тыя часы не мог пакінуць раўнадушным. Па сюжэце мімаходзь згадваецца, што ў камандзіра быў няўдалы шлюб, а Зіноўеву ў армію прывялі любоўныя праблемы. Падчас вучэнняў група пранікае ў падземныя камунікацыі ўмоўнага праціўніка. Той, выявіўшы «дыверсантаў», адключае святло.

> **«І не сорамна вам, дзяўчына, такія сексуальныя фантазіі ў мяне выклікаць?!»**

Капітан-лейтэнант дае каманду: «Сяржант, падсвяці!» Зіноўева вокамгненна зрывае з пляча аўтамат і пачынае біць уверх кароткімі чэргамі (патроны халастыя — гэта ж вучэнні). У кароткіх успышках ад полымя, якое вырываецца са ствала зброі, мы бачым яе твар, яго твар, патрэбны кабель, які трэба перарэзаць... Апёкшыся аднойчы ў жыцці, і яна, і ён не жадаюць больш зведаць падобнага, як і прычыніць боль іншаму. Абодва выглядаюць і паводзяць сябе сурова, зноў жа накладае адбітак армейская субардынацыя. Аднак відавочна тое, што паміж імі ёсць нешта няўлоўнае, што іх звязвае. Не гаворачы нічога, толькі адным фактам прысутнасці побач яны падсвечваюць жыццё адно аднаму...

Праўда, і «падсвечваць» можна па-рознаму. Вось таксама армейская гісторыя ў тэму, пачутая ад бывалага чалавека. Служыў з ім адзін прапаршчык, загадваў сталовай. Скарыстаўшы апошнюю акалічнасць, вёў неблагую ўласную падсобную гаспадарку: адкормліваў свіней, качак, трусоў адходамі з салдацкага стала. І вось неяк вяртаецца ён у часць... з велізарным «ліхтаром» пад вокам. Камандзір убачыў: «Хто?» «Ліда!» — дакладвае прапаршчык. Жонка, значыць, жанчына мажная і з суровым характарам. Як потым высветлілася, саслужыўшы вайсковую выслужыўцы пажартаваць: падкінулі ў бачкі для харчовых адходаў... прэзерватывы. «Дык вось вы чым займаецеся на тым палігоне», убачыўшы іх, імгненна вынесла прысуд Ліда і «падсвяціла» мужу вока. («Муж сказаў, што паміж намі няма іскры. Купіла электрашокер... Калі ачомаецца, спытаю яшчэ раз».) Ну, а з іншага боку, без кахання яна б так не зрабіла, праўда? Як у тым анекдоце. «Нічога нельга рабіць без любові. Таму посуд мыць не буду!»

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «У маёй працы карысны нават малаток»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

***— Ты сам навучыўся?***

— Так, у асноўным сам. Каб навучыцца, патрэбна вельмі шмат часу. Многае трэба асэнсоўваць самастойна, ніводны ўніверсітэт не навучыць, як працаваць. Карысным можа стаць досвед калег. Некаторыя замежныя кампазітары на сваіх старонках дзеляцца сакрэтамі майстэрства, выдаюцца адмысловыя часопісы для дызайнераў гуку. Толькі сёння, гадоў праз пяць самастойных заняткаў, я магу сказаць, што напісаў нешта вартае. Але ўсё роўна гэта не галівудскі ўзровень. Насамрэч, пісаць музыку для кіно і гульняў вельмі цікава. Але пакуль што ў Беларусі мала людзей, якія займаюцца гэтай справай.

***— Якія свае работы можаш назваць у ліку найлепшых?***

— Ёсць праекты, у стварэнні якіх я ўдзельнічаў, дзе мне падабаецца музыка, але сам вынік атрымаўся не надта «выбухным». Напрыклад, запомнілася адна гульня, для якой я напісаў саўндтрэк. Там гучыць аркестр, сумешчаны з этнічнымі інструментамі. Музыка атрымалася проста выдатная, але, на жаль, гульня закрылася праз паўгода пасля выпуску.

> **«Лязгат мячоў, што мы чуем у фільмах, — гэта часцей за ўсё гукі бразгання сталовых прыбораў. Для гэтага няма сэнсу набываць сапраўдную зброю».**

***— Ты аўтар музычнага праекта Dzivia, досыць папулярнага ў колах аматараў цяжкой музыкі. Як творчасць у яго межах суаднosіцца з, так бы мовіць, камерцыйным кампазітарствам?***

— Дзякуючы менавіта гэтаму музычнаму праекту мяне заўважылі як кампазітара. Гэта было ў час, калі я нават не здагадваўся, што магу працаваць у гэтым кірунку і зарабляць грошы. Прынамсі, у нас. Dzivia існуе ўжо досыць доўга. Я вельмі даўно займаюся гэтым праектам і проста не магу яго кінуць. Як сесійны музыкант удзельнічаю ў іншых гуртах, больш мэйнстрымавых. Часам вельмі шкадую, што і сам не пачаў іграць стандартную музыку з дзвюма гітарамі, басам, барабанамі і вакалам *(смяецца)*. Напрыклад, мне вельмі складана знайсці барабаншчыка: патрэбны чалавек, які мае свой вельмі этнічны інструмент і грае на ім. Такіх у нашай краіне адзінкі. Але Dzivia існуе, развіваецца. Мы запісваем новы альбом. Да ўдзелу ў праекце я запрасіў яшчэ каля дзесяці музыкантаў. Палова з іх — гэта вакалісты. Зараз збіраю жывы склад, спрабую зладзіць выступленне. Мы плануем канцэрты і хочам выйсці са студыйнага фармату.

***— Не баішся выйсці да публікі?***

— Гэта для мяне больш страшна, чым удзельнічаць у канцэртах як музыкант. Першае выступленне з Dzivia будзе як першы раз на сцэне ўвогуле. Я ўпершыню выйду да слухача менавіта са сваім праектам. Як музыкант выступаю з іншымі гуртамі, часам удзельнічаю ў вялікіх канцэртах высокага ўзроўню, але гэта не мае праекты, таму не надта хвалююся. Але ў Dzivia ўся музыка мая.

***— Адкуль такое жаданне іграць музыку, не падобную на тую, што выконваюць іншыя нашы гурты?***

— У Беларусі няма гуртоў, якія іграюць аркестравую музыку для «металістаў». Я не ведаю, як ахарактарызаваць стыль, у якім я іграю, часам называю яго pagan orchestral — гэта нешта сярэдняе паміж фальклорам, аркестравай музыкай і «металам». Хоць тут няма характэрных рыс апошняга — гітар, гучных барабанаў, але ёсць адмысловы вакал, эпічнасць. Цікава, што маю музыку пачалі слухаць менавіта «металісты».

***— Ты сам разумееш, калі напісаў нешта сапраўды грандыёзнае, што яно спадабаецца людзям?***

— Нічога такога няма. Калі б я знарок пісаў музыку, якая падабалася б людзям, то мая творчасць была б іншай. Магчыма, больш папсовай, можа быць, я іграў бы «метал». Але ў творчасці арыентуюся толькі на ўласны густ.

***— Сёння фолк у музыцы надзвычай актуальны, запатрабаваны і нават папулярны. Як бачыцца праект Dzivia ў кантэксце музычнай сцэны краіны?***

— У мяне крыху іншая музыка. У нас многа каманд, падобных на «Старога Ольсу». Гэтая музыка вельмі добра падыходзіць для фестывальяў сярэднявечнай культуры, стварае антураж, але як сама па сабе для мяне нецікавая. Мне падабаецца Re1ikt — вельмі незвычайны праект для Беларусі, я неяк выпадкова трапіў на іх канцэрт і дагэтуль з захапленнем слухаю. Таксама на ўзроўні музыка Drwiwy. А ў цэлым я многа слухаю «метал» і нікому не вядомыя, амаль андэграўндныя гурты.

***— Што параіў бы маладым людзям, якія хочуць пісаць музыку?***

— Не рабіце гэтага! Кампазітарствам у нас вельмі складана займацца, а зарабляць — амаль немагчыма, здымаецца вельмі мала фільмаў. Калі параўнаць, напрыклад, з Францыяй, дзе амаль кожны трэці чалавек нейкім чынам звязаны з кіно, а кампазітары нават могуць выбіраць найцікавейшыя з некалькіх прапаноў. Большасць нашых кампазітараў, таксама як і праграмістаў, працуюць на краіны Еўропы. У нас гэта незапатрабаваная справа. Трэба самому шукаць заказы, нейкім чынам «круціцца».

> **«Праз пяць гадоў самастойных заняткаў я магу сказаць, што напісаў нешта вартае. Але ўсё роўна гэта не галівудскі ўзровень».**

***— Можа, раскрыеш сакрэты, як запісваюцца гукі для кіно, гульняў?***

— Гэта вельмі цікава і часам непрадказальна. Напрыклад, для гульні патрэбна запісаць начны лес. Прычым заказчык патрабуе арыгінальную мелодыю. Таму едзеш ноччу ў лес з мікрафонам, ноўтбукам і начуеш там у спальніку. Хрумсценне снегу запісваецца паралонам, а ўдары ў цела — насамрэч удары у памідоры. Лязгат мячоў, што мы чуем у фільмах, — гэта часцей за ўсё гукі бразгання сталовых прыбораў. Для гэтага няма сэнсу набываць сапраўдную зброю. Вельмі карысны ў працы кампазітара і малаток, якім на кухні мяса адбіваюць. У гульні цікава гукамі паказваць персанажа. Ён робіць рух — і яго трэба паўтарыць у гуку, пры гэтым сінхранізаваць з рэчаіснасцю.

***— Напэўна, усе сталовыя прыборы пабывалі ў цябе ў студыі?***

— Так. Няма студыі, дзе імі не карысталіся б для запісу *(смяецца)*. Калі прыходзіш на студыю па агучванні, там можна знайсці што заўгодна — як у анекдоце пра жаночую сумачку. Любая дробязь істотная.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 04.01.2017 г.